УДК 93/94

# ГІСТОРЫЯ ЗАМОЙСКАГА СІНОДА 1720 г. У ПРАЦЫ І. Х. СТРАЛЬБІЦКАГА «УНИАТСКИЕ ЦЕРКОВНЫЕ СОБОРЫ С КОНЦА XVI в. ДО ВОССОЕДИНЕНИЯ УНИАТОВ С ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКОВЬЮ», 1891 г.

**Караблёў Ю. Ю.**
ДУА «Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва»
(Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. Па прычыне сваёй значнасці ў развіцці грэка-каталіцтва на землях Рэчы Паспалітай Замойскі сабор выклікаў мноства супрацьлеглых рэакцый у інтэлектуальным асяроддзі. Адны аўтары выказвалі падтрымку вынікам сабору, іншыя рэзка крытыкавалі яго наступствы. Да апошняй групы належыць і І.Х. Стральбіцкі (1861–1934 гг.) – духоўны пісьменнік, барацьбіт за традыцыйнае праваслаўе. Ва ўмовах нешматлікай колькасці спецыяльнай літаратуры па гэтай тэме пункт погляду Стральбіцкага выдзяляецца сярод іншых і патрабуе сучаснага аналізу.

Ключавыя словы: гістарыяграфія; Замойскі сінод 1720 г.; І.Х. Стральбіцкі.

Abstract. Due to its great importance in the subsequent development of Greek-Catholicism in the Polish-Lithuanian Commonwealth, Synod of Zamość caused many opposite reactions in the intellectual environment. Some authors have expressed support for its results, while others have sharply criticized its consequences. The last group included I.Kh. Strelbitsky (1861-1934), – spiritual writer, fighter for traditional Orthodoxy. In the context of a small circle of special literature on this topic, Strelbitsky's point of view is encountered by many people studying this problem and requires modern analysis.

Keywords: historiography; Synod of Zamość 1720; I.Kh. Strelbitsky.

Замойскі царкоўны сабор, які праходзіў у перыяд з 26 жніўня па 17 верасня 1720 г., з пункту гледжання Рыма меў статус правінцыяльнага сінода ўніяцкай царквы Рэчы Паспалітай. Сабор быў арганізаваны на падставе звароту ўніяцкага мітрапаліта Льва Кішкі да Папы Клімента XI. Апостальскую сталіцу на ім прадстаўляў нунцый Геранім Грымальдзі. Першапачатковым месцам правядзення сабору быў абраны Львоў, аднак у сувязі з эпідэміяй мерапрыемства было перанесена ў мястэчка Замосце [1].

На саборы меркавалася вырашыць усе вострыя пытанні, існаваўшыя ў жыцці ўніяцкай царквы. Вынікам сабору было канчатковае прыняцце ва ўніяцкай царкве Рэчы Паспалітай Filioque па лацінскім абрадзе. Адбылося ўнутранае ўладкаванне духоўнай і гаспадарчай дзейнасці ўніяцкай царквы. Пасля Замойскага сабору канчаткова склалася сукупнасць адрозненняў, якія адмежавалі ўніяцкую царкву ад папярэдняй праваслаўнай, быў здзейснены зварот у бок рымска-каталіцкай царкоўнай традыцыі [1].

У сувязі са сваёй значнасцю Замойскі сабор атрымаў шэраг супярэчлівых адзнак у гістарыяграфіі. Адну з адзнак дадзенай падзеі прапанаваў Іаан Хрысанфавіч Стральбіцкі (1861–1934 гг.), які выступаў з рэзкай крытыкай Замойскага сабору.

Сам І. Х. Стральбіцкі быў дзеячам рускай праваслаўнай царквы апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. Ён паходзіў са старажытнага Галіцка-Валынскага шляхецкага роду, быў сынам грэка-каталіцкага протаіерэя Каменец-Падольскай епархіі – Хрысанфа Іосіфавіча Стральбіцкага і пляменнікам архіепіскапа Валынскага і Жытомірскага Мадэста Стральбіцкага [2; 3; 4, с. 3-4].

І. Х. Стральбіцкі ў 1881 г. пасля заканчэння Холмской духоўнай семінарыі навучаўся ў Кіеўскай духоўнай акадэміі, а з 1885 г. служыў у Адэсе. Тут ён выкладаў у Адэскай жаночай гімназіі, з 1898 г. быў настаяцелем царквы ў імя Св. Велікамучаніцы Аляксандры. У далейшым Іаан Хрысанфавіч стаў шырока вядомы ў якасці духоўнага пісьменніка [4, с. 3-4].

Лейтматывам прац І. Х. Стральбіцкага выступала выкрыццё разнастайных рэлігійных накірункаў, проціпастаўляўшыхся традыцыйнаму праваслаўю. Так, ён выступаў з крытыкай – уніі, стараабраднецтва, штундызму і гэтак далей. У гістарыяграфічным плане аўтар быў блізкі да заходнерускай гістарычнай школы, для якой асаблівую значнасць мела паслядоўная крытыка Брэсцкай царкоўнай уніі і ўніяцкай царквы. Варта адзначыць, што адным з магчымых каталізатараў узнікнення заходнерускай традыцыі мог быць менавіта Замойскі сабор [5, с. 8].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

У гэтым святле не здзіўляе тое, што І. Х. Стральбіцкі выступаў з крытыкай пастаноў Замойскага сабора 1720 г. Напрыклад, у сваім нарысе да 50-гадовага юбілею Полацкага сабору 1839 г. ён узгадвае Замойскі сабор наступым чынам: «Риму было не безызвестно, как принимается западно-русским народом ненавидимая им, созданная иезуитами уния. Но он позорно игнорировал это, ибо смотрел на унию как на первый шаг к обращению православных в латинство… Замойский собор 1720 г. был вторым фазисом жизни униатской церкви… когда… можно было и узаконить то, что прежде вводилось нерешительно и осторожно» [6, с. 7-9].

Тут галоўны пасыл аўтара ў наяўнасці намеру з боку Рыму і ўладаў Рэчы Паспалітай, нацэленага на паступовы зварот праваслаўных да каталіцтва. Драйверам гэтага працэсу нібы выступалі езуіты і самі ўлады Рэчы Паспалітай (якую аўтар называе не інакш як Польшча). Шырэй свой пункт гледжання на падзеі Замойскага сабору І.Х. Стральбіцкі раскрывае ў адпаведным раздзеле сваёй кнігі: «Униатские церковные соборы с конца XVI в. до воссоединения униатов с православною церковью». Раздзел «Замойский собор» у выданні 1891 г. займае ад 92 па 131 старонку і ўяўляе сабой разгорнутую пазіцыю І.Х. Стральбіцкага адносна гэтай вяхі ў жыцці ўніяцкай царквы.

Па меркаванні Стральбіцкага, напярэдадні Замойскага сабору ўніяцкая царква ўжо была гатова зліцца з каталіцкай дзякуючы намаганням уніяцкіх мітрапалітаў, прыхільных да лацінскага абраду і дзейнасці ордэна базыльян (ордэна Св. Васіля Вялікага). Затым аўтар абвінавачвае ўніяцкіх мітрапалітаў у празмернай добразычлівасці да лацінства, выдзяляючы мітрапаліта К. Жахоўскага. Пры гэтым ён паказвае, што лацінізацыя ўніі садзейнічалі ўсе знешнія умовы, у тым ліку дзейнасць Рыма і езуітаў [7, с. 92].

Галоўным правадыром працэсу лацінізацыі ўніяцкай царквы І.Х. Стральбіцкі называе ордэн базыльянаў, які нібыта ператварыўся ў непасрэдны інструмент Рыма ўнутры ўніяцкай царквы. Затым аўтар піша пра праблему пераходу ўніятаў да каталіцтва, прыводзіць факты аб наяўнасці скаргаў у Рым аб пераходзе з уніі ў чысты каталіцызм [7, с. 93].

У сваю чаргу, галоўнай апорай у захаванні ўсходняга абраду ва ўніяцкай царкве таго часу Стральбіцкі лічыць простае парафіяльнае духавенства. Аўтар піша аб радавым духавенстве, што яно «забитое… бедное… невежественное», акцэнтуючы ўвагу на бездапаможнасці простага духавенства перад царкоўнымі іерархамі, якія былі выхадцамі з асяроддзя базыльян [7, с. 94].

Аўтар вылучае дзве прычыны склікання сабору: з аднаго боку імкненне часткі ўніяцкіх іерархаў ліквідаваць бязладдзіцу ў царкоўным жыцці і вярнуць праваслаўнае аблічча ўніі, а з другога боку, цалкам супрацьлеглае імкненне базыльянаў дабіцца большай лацінізацыі ўніяцкай царквы [7, с. 94-95].

Стральбіцкі бачыць намер і ў тым, што адказ Рыма са згодай на правядзенне правінцыяльнага сабору прыйшоў мітрапаліту Л. Кішку 20 сакавіка 1716 г., а адбыўся сабор толькі ў 1720 г. Далей ён прыводзіць чытача да думкі, што гэтае прамаруджванне было звязана з падрыхтоўкай да царкоўнага сабору з боку Рыма і базыльян [7, с. 96-97].

Іаан Хрысанфавіч звяртае ўвагу і на тое, што Папа прызначыў ганаровым старшынёй царкоўнага сабору свайго нунцыя ў Польшчы Геранімa Грымальдзі, і на рашэнне Папы Рымскага на час правядзення сабору прыпыніць дзеянне ранейшых канстытуцый і апостальскіх дэкрэтаў, якія перашкаджалі пастановам сабору. Гэта магло сведчыць пра сур'ёзныя планы з боку Рыма адносна вынікаў новага сабору [7, с. 96-98]. І.Х. Стральбіцкі пры гэтым выкрывае Папу ў хітрасці і хлуслівасці яго прамоў у адносінах да ўніятаў, падкрэсліваючы, што ў рэальнасці Рым імкнуўся толькі да паглынання ўніяцкай царквы лацінскім абрадам [7, с. 100].

Крытыцы з боку Стральбіцкага падвяргаецца і перанос царкоўнага сабору са шматлюднага Львова ў Замосце. Заяўленай прычынай пераносу месца правядзення сабору з'яўлялася маравая пошасць у горадзе. Аўтар сумняваецца ў сур'ёзнасці пагрозы, падводзячы да думкі, што перанос месца правядзення сабору быў выкліканы асцярогай негатыўнай рэакцыі гараджан на рашэнні сабору [7, с. 101].

Далей аўтар пералічвае ўдзельнікаў царкоўнага сабору, акцэнтуючы ўвагу на тым, што на саборы, за выключэннем аднаго чалавека, не былі прадстаўлены дэлегаты ад парафіяльнага ўніяцкага духавенства і што ўдзельнікі, уключаючы прэсвітараў, не да канца разумелі праблемы простага парафіяльнага духавенства і шмат у чым разыходзіліся з ім у поглядах [7, с. 102-103].

Потым Стральбіцкі аналізуе прамову нунцыя Гераніма Грымальдзі на першым пасяджэнні сабору. На думку Іаана Хрысанфавіча, першачарговай задачай сабору было канчатковае прыняцце рымска-каталіцкага сімвалу веры і замацаванне лацінскай абраднасці ва ўніяцкай царкве. У сваёй прамове нунцый звярнуў увагу членаў сабору на неабходнасць выкаранення злоўжыванняў у царкве. Стральбіцкі акцэнтаваў увагу на тым, што Рым імкнуўся ліквідаваць практыку прызначэння святароў парафіянамі, якая ўсталявалася ва ўніяцкай царкве «после многих случаев измены православию пастырей» [7, с.103-104].

Затым Іаан Хрысанфавіч апісвае далейшы ход царкоўнага сабора. Пасля прамовы нунцыя ў пачатку сабора было зачытана пасланне Папы, затым пастановы Трыдэнцкага сабору, пасля якіх ішло вызнанне веры па формуле Урбана VIII і прызнанне ўсіх царкоўных сабораў, якія прайшлі з ухвалой Рыма, уключаючы скандальны Фларэнтыйскі сабор. Удзельнікі сабору, на думку аўтара, былі пастаўлены перад фактам, і ім нічога не заставалася, акрамя як пагадзіцца з усім парадкам дня сабору, каб пачаць абмеркаванне сапраўды важных для іх праблем. Прыняцце вызнання веры па формуле Урбана VIII замацоўвалася подпісамі членаў сабору, якія збіраліся на працягу ўсяго мерапрыемства [7, с. 106-107].

Другая сесія сабору прайшла 1 верасня 1720 г., у ходзе якой былі зачытаны царкоўныя дакументы, якія растлумачваюць пазіцыю Рыма па розных дагматычных і абрадавых пытаннях, даваліся тлумачэнні тых ці іншых дэталяў веравучэння, праходзіў дадатковы збор подпісаў на карысць рашэнняў, прынятых у першы дзень працы сабора. Пасля прачытання ўсіх дакументаў і тлумачэнняў, а таксама пасля завяршэння збору подпісаў другая сесія была закрыта [7, с. 108].

Апошняя сесія Замойскага сабору прайшла 17 верасня 1720 г. Такі вялікі перапынак быў звязаны з падрыхтоўкай палажэнняў па абрадах, царкоўнай дысцыпліне і гаспадарчым жыцці царквы [7, с. 109]. І.Х. Стральбіцкі дастаткова падрабязна апісвае змест усіх саборных пастаноў і ў канцы звяртае ўвагу чытача, што падпісаныя палажэнні адразу пасля завяршэння мерапрыемства прайшлі праз кангрэгацыі «s. concilii Tridentini» і «de propaganda fide» і былі зацверджаны Папам Інакенціем XIII, але, нягледзячы на гэта, яны былі апублікаваны толькі ў 1724 г. [7, с. 127].

Далей аўтар піша пра тое, што айцы сабору зрабілі вялікую працу, адзначаючы іх скрупулёзнасць у рэгламентацыі пытанняў абрадаў, царкоўнай дысцыпліны і да т.п. Затым яго пахвала айцоў сабора прымае саркастычны характар, ён адзначае: «Отцы собора сделали больше того, что предполагалось (разумеем латинскую партию); они сделали постановления и относительно католической веры и определили их прежде всего» [7, с. 127].

Іаан Хрысанфавіч далей піша пра тое, што ў выніку Замойскага сабору ўдалося надаць законную форму далейшай лацінізацыі ўніяцкай царквы. Далейшы лёс, на думку І. Х. Стральбіцкага, немінуча асуджаў унію на зліццё з каталіцтвам. Аўтар прызнае, што ў выніку Замойскага сабору ў царкве ўсталяваўся большы парадак, чым быў раней, але пры гэтым, на думку аўтара, былі страчаны апошнія шанцы на самастойную будучыню ўніі. Стральбіцкі бачыць прычыну такой сітуацыі ў шкодніцкіх дзеяннях езуітаў І базыльян, у безабароннасці, неадукаванасці, нязначнасці ўнутры царквы белага ўніяцкага духавенства [7, с. 129].

Далей аўтар у чарговы раз выказвае думку, што лацінства (рымска-каталіцкая традыцыя) было глыбока ненавісна «заходне-рускаму» народу, але пасля Замойскага сабору ён быў асуджаны цярпець лацінства. І ў доказ свайго меркавання Стральбіцкі прыводзіць наступную думку з «Wspomnienia narodowe» Я. Геленіўша: «Упомянутый собор в десять лет сделал более, чем перед тем сделали века». Затым Іаан Хрысанфавіч згадвае пазіцыі польскіх аўтараў – Астроўскага і Лікоўскага, якія ўсхваляюць сабор. Тым самым аўтар імкнецца развіць думку аб тым, што такая пахвала сабору ад палякаў гаворыць у першую чаргу пра яго карысць для рымска-каталіцкай царквы І самой Польшчы [7, с. 130].



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

У цэлым, можна прыйці да высновы, што пазіцыя І. Х. Стральбіцкага адносна Замойскага сабору была рэзка крытычная. Духоўны пісьменнік бачыў у падзеях сінода чарговую фазу паглынання ўніяцкай царквы Рэчы Паспалітай рымска-каталіцкім касцёлам і імкнуўся паказаць чытачу несправядлівасць падрыхтоўкі, ходу і рашэнняў Замойскага сабору адносна белага ўніяцкага духавенства і ўсёй уніяцкай паствы. Стральбіцкі прызнаваў наспелую патрэбнасць у рэфармаванні ўніяцкай царквы ў пачатку XVIII ст., таксама як і сур'ёзнасць праведзенай саборам работы, аднак ён імкнуўся даказаць, што зварот у бок рымскага каталіцызму, які адбыўся ў развіцці грэка-каталіцкай царквы пасля сабору, быў вынікам карыслівага намеру з боку Рыма, Польшчы і базыльян, з-за якога адбыўся далейшы заняпад уніі як самастойнай з'явы.

**Літаратура**


1. Морозова, С. В. Замойский собор [Электронный ресурс] / belchrist.narod.ru. – Режим доступа: http://belchrist.narod.ru /pages/7_cark_zhyccio/zamojcki.htm. – Дата доступа: 20. 11. 2021.
2. Стрельбицкий, Иоанн Хрисанфович [Электронный ресурс]. / ЭСБЕ в 86 т., Т. 31. – ru.wikisource.org. – Режим доступа: https://inlnk.ru/ag0oz. – Дата доступа: 20.01.2021
3. Купчінскій, О. Акти та документи галицько-волинського князівства XIII – першої половини XIV століть. Дослідження. Тексти [Электронный ресурс] / Навукове товариство ім. Шевченка. – Режим доступа: http://ntsh.org/kupch-book1. – Дата доступа: 21.01.2021
4. Двадцатипятилетие учебно-педагогической и пастырской службы протоиерея Иоанна Хрисанфовича Стрельбицкого / Одесса : тип. Е.И. Фесенко, 1911. – 67 с.
5. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі у XIX і пачатку XX в. / А. Цвікевіч, пасьляслоўе А. Ліса. 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
6. Стрельбицкий, И. Х. Пятидесятилетие воссоединения белорусских униатов. (1839-1889) : ист. очерк / И. Х. Стрельбицкий. – Вильна : Губ. тип., 1889. – 61 с.
7. Стрельбицкий, И. Х. Униатские церковные соборы с конца XVI века до воссоединения униатов с православною церковью / И. Х. Стрельбицкий. – Одесса : Тип.-хромолит. Е. И. Фесенко, 1891. – 164 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова